НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

# ДЫНАМІКА ЛІТАРАТУРНАЙ НОРМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

14277

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Філіял «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа
і Янкі Купалы»

# ДЫНАМІКА ЛІТАРАТУРНАЙ НОРМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Мінск
«Беларуская навука»
2015

УДК 811.161.3-26"19/20"
ББК 81.2Беи-3
Д89

А ў т а р ы:
Н. П. Еўсіевіч, Л. А. Ліхадзіеўская, В. П. Русак, А. М. Сяргеева,
В. Л. Татур, В. І. Уласевіч, Н. А. Чабатар, К. Д. Шчасная

Н а в у к о в ы р э д а к т а р
доктар філалагічных навук В. П. Русак

Р э ц э н з е н т ы:
доктар філалагічных навук прафесар В. Д. Старычонак,
кандыдат філалагічных навук Г. К. Чахоўскі

Д89 **Дынаміка** літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы / Н. П. Еўсіевіч [і інш.] ; навук. рэд. В. П. Русак ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Філіял «Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы». – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 440 с.

ISBN 978-985-08-1877-5.

Манаграфія прысвечана аналізу змен і заканамернасцей пісьмовай беларускай мовы на рубяжы XX–XXI стст.

У даследаванні абагульнены асаблівасці сучаснага слоўнікавага складу, прадстаўлены новы лексічны матэрыял, які актыўна выкарыстоўваецца ў СМІ. Прадстаўлена сістэмнае суаднясенне кадыфікаваных словазмяняльных, словаўтваральных, сінтаксічных норм і моўнай практыкі.

У манаграфіі выкарыстаны матэрыялы тэмы «Запазычаная лексіка сучаснай беларускай мовы: фанетыка-граматычныя тэндэнцыі засваення», якая выконвалася па дагаворы з БРФФД № Г12 – 063 ад 15.04.2012 г.

**УДК 811.161.3-26"19/20"**
**ББК 81.2Беи-3**

**ISBN 978-985-08-1877-5**

14277
БІБЛІЯТЭКА
ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

© Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, 2015
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2015

# УВОДЗІНЫ

Даследаванне важнейшых праблем, звязаных з нарматыўнымі працэсамі функцыянавання граматычнай і сінтаксічнай сістэм беларускай літаратурнай мовы на рубяжы XX–XXI стст., накіравана на стварэнне аб'ектыўнай карціны моўнай арганізацыі сучаснай пісьмовай формы мовы. Актуальнасць падобнага даследавання абумоўлена некалькімі прычынамі, у першую чаргу ўзрастаючай неабходнасцю ўсебаковага вывучэння розных узроўняў беларускай літаратурнай мовы ў перыяд дзяржаўнага двухмоўя, а таксама неабходнасцю выпрацоўкі навуковых рэкамендацый па нарматыўным выкарыстанні разнастайнага па сваім складзе беларускага лексічнага матэрыялу.

Уведзеная ў дзеянне новая рэдакцыя «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»[1], не парушаючы асноўных палажэнняў і прынцыпаў беларускай арфаграфіі, выклікала сістэмныя змены пры перадачы акання/якання, «ў» (у нескладовага), пры напісанні складанаскарочаных слоў, некаторых марфем у асобных групах назоўнікаў, дзеясловаў, прыметнікаў, пры выкарыстанні вялікай і малой літары. Праведзенае даследаванне здымае вялікае кола праблем, звязаных са збліжэннем арфаграфічных навыкаў з уласна моўнымі ведамі носьбітаў беларускай літаратурнай мовы, паглыбленнем гэтых ведаў у працэсе азнаямлення з тэарэтычным і практычным матэрыялам, што паспрые павышэнню якасці адукацыі і агульнай пісьменнай культуры ўвогуле.

У манаграфіі даследуюцца тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты, звязаныя з нармалізацыяй сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Паэтапнае сістэмнае суаднясенне моўнай практыкі і кадыфікаваных (зарэгістраваных у нарматыўных працах) норм дазволіла ўстанавіць тыпалагічныя заканамернасці парадыгматыкі і сінтагматыкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Дзякуючы прадстаўленню новага слоўнага матэрыялу, які актыўна выкарыстоўваецца ў сучасным друку, складваецца больш поўнае ўяўленне аб крыніцах папаўнення і працэсах адаптацыі лексічнага складу мовы. У цэлым даследаванне спектра важнейшых праблем, звязаных з нарматыўным функцыянаваннем сучаснай граматычнай і сінтаксічнай сістэмы, накіравана

---

[1] Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі: [Закон Рэспублікі Беларусь 23 ліпеня 2008 г. № 420-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 г.: адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 г.]. Мінск: Нац. цэнтр прав. інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 143 с.

на стварэнне маштабнай карціны моўнай арганізацыі пісьмовай формы мовы. Для навуковага разумення працэсаў словазмяняльнай і словаўтваральнай структуры слова, распаўсюджанасці і функцыянавання новых слоў у мове падрыхтаваны адпаведныя раздзелы манаграфіі, у якіх апісваюцца экстра- і інтралінгвістычныя тэндэнцыі нарматыўнага замацавання пісьмовых форм у розныя перыяды станаўлення і развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

На працягу ўсяго часу існавання акадэмічнага інстытута мовазнаўства – вядучай навуковай установы па даследаванні актуальных праблем беларускай мовы – яго вучоныя выпрацоўваюць стандарты моўнага нарміравання, якія замацоўваюцца ў зводах правіл арфаграфіі і пунктуацыі, а таксама фіксуюцца ў фундаментальных работах: нарматыўных граматыках, разнапрофільных слоўніках, практычных даведніках, зборніках па культуры мовы і стылістыцы. Устанаўленне зводу граматычных правіл традыцыйна з'яўлялася асноўнай функцыяй акадэмічных апісальных граматык, пры гэтым вычарпальная паслоўная кадыфікацыя форм у граматыках не праводзілася, але, як правіла, паралельна выдаваліся адпаведныя лексікаграфічныя даведнікі, у якіх рэгламентаваліся акцэнталагічныя, словазмяняльныя (г. зн. граматычныя) і словаўтваральныя варыянты, варыянты словаўжывання, звязаныя з лексіка-семантычнымі з'явамі. У навейшых выданнях бягучага стагоддзя ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве праблемы пісьмовай нормы пададзены двума ўзаемадапаўняльнымі спосабамі арфаграфічнага апісання. Актуальныя стандарты моўнага нарміравання зафіксаваны ў тэарэтычным і прыкладным аспектах у комплексе прац – пры дапамозе граматыкі і граматычных слоўнікаў знамянальных часцін мовы, у якіх прадстаўлены акцэнтуацыйная і словазмяняльная парадыгмы болей чым ста тысяч слоў. Такім чынам, сучасныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя прадпісанні зафіксаваны ў выглядзе абавязковага і афіцыйна зацверджанага дакумента, а адзінае нарматыўнае напісанне слоў падаецца ў граматычна-арфаграфічных слоўніках знамянальных часцін мовы і двух тамах граматыкі.

Паняцце нормы – цэнтральнае ў вызначэнні літаратурнай мовы як у яе пісьмовай, так і вуснай форме зносін. Літаратурная мова развіваецца і толькі час ад часу мяняе ўстарэлыя нормы на больш характэрныя з пункту погляду нацыянальнай спецыфікі, таму неабходна імкнуцца без дастатковых падстаў не адыходзіць ад тых норм, якія склаліся на сучасным этапе яе развіцця. Навуковыя рэкамендацыі і нормы павінны строга ахоўвацца ўсімі членамі грамадства, бо толькі абавязковае падпарадкаванне моўным нормам забяспечвае стабільнае функцыянаванне літаратурнай мовы, яе прэстыж у свеце.

Вынікі і матэрыялы даследавання разлічаны на шырокае практычнае прымяненне карыстальнікамі пісьмовай мовы. У новым моўным матэрыяле зацікаўлены беларуская марфалогія, лексікалогія і лексікаграфія. Вынікі і матэрыялы даследавання знойдуць прымяненне пры складанні разнастайных дапаможнікаў па граматыцы беларускай мовы, пры распрацоўцы спецкурсаў

і правядзенні спецсемінараў па марфалогіі і сінтаксісе ў ВНУ краіны. Практычныя матэрыялы манаграфіі і вывады могуць быць карыснымі для выкладчыкаў і студэнтаў філалагічных факультэтаў, школьных настаўнікаў.

Кніга падрыхтавана аддзелам сучаснай беларускай мовы філіяла «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Аўтарамі асобных частак манаграфіі з'яўляюцца: доктар філалагічных навук, навуковы рэдактар В. П. Русак (уводзіны, раздзелы 1 і 7, падраздзел 7.1–7.2, 7.4–7.5 і заключэнне), кандыдат філалагічных навук К. Д. Шчасная (раздзел 2, падраздзелы 2.2, 2.13, 2.14, 2.16), Н. А. Чабатар (падраздзелы 2.1, 2.3–2.12, 2.15), Л. А. Ліхадзіеўская, В. Л. Татур (раздзел 3), кандыдат філалагічных навук В. І. Уласевіч (раздзел 4), кандыдат філалагічных навук А. М. Сяргеева (раздзел 5), кандыдат філалагічных навук Т. Я. Шэмет (раздзел 6), Н. П. Еўсіевіч (падраздзел 7.3). Для навуковага разумення працэсаў словазмяняльнай і словаўтваральнай структуры слова, распаўсюджанасці і функцыянавання новых слоў у мове падрыхтаваны адпаведныя раздзелы манаграфіі, у якіх апісваюцца экстра- і інтралінгвістычныя тэндэнцыі функцыянавання і нарматыўнага замацавання пісьмовых форм знамянальных часцін мовы. У канцы кнігі таксама знаходзяцца спісы: умоўных скарачэнняў (граматычных і стылістычных памет), прынятых абазначэнняў, скарочаных назваў слоўнікаў, граматык, дапаможнікаў, часопісаў, газет.

Спасылкі на выкарыстаную ў тэксце літаратуру і спасылкі пад сімвалам *, якія ўтрымліваюць неабходныя ўдакладненні і тлумачэнні, размяшчаюцца ў канцы старонкі.

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** ........ 3

**РАЗДЗЕЛ 1. Станаўленне норм беларускай літаратурнай мовы ў гісторыка-культурным аспекце** ........ 6

1.1. Пачатак выпрацоўкі літаратурнага варыянта новай беларускай мовы ........ 14
1.2. Першыя спробы граматычнай нармалізацыі беларускай мовы ........ 19
1.3. Стварэнне першага кадыфікацыйнага зводу сучаснай беларускай мовы і рэформа беларускага правапісу ........ 26
1.4. Праблемы правапіснай нормы беларускай мовы ў другой палове XX ст. ........ 33
1.5. Правапісныя нормы беларускай мовы перыяду глабалізацыі XXI ст. ........ 46

**РАЗДЗЕЛ 2. Станаўленне і развіццё норм словазмянення назоўнікаў сучаснай беларускай мовы ў XX–XXI стагоддзях** ........ 57

**Адзіночны лік** ........ 72

2.1. Родны склон назоўнікаў мужчынскага роду ........ 72
2.2. Новыя словы мужчынскага роду ў родным склоне ........ 78
2.3. Месны склон асабовых назоўнікаў мужчынскага роду з чыстай асновай ........ 86
2.4. Месны склон неасабовых назоўнікаў мужчынскага роду з чыстай асновай ........ 89
2.5. Канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду на *-а (-я)* і агульнага роду ........ 93

**Множны лік** ........ 100

2.6. Родны склон назоўнікаў мужчынскага роду ........ 100
2.7. Родны склон назоўнікаў жаночага роду з чыстай асновай ........ 102
2.8. Родны склон назоўнікаў ніякага роду ........ 103
2.9. Родны склон множналікавых назоўнікаў ........ 106
2.10. Асаблівасці ад'ектыўнага скланення назоўнікаў ........ 110
2.11. Характэрныя словазмяняльныя рысы зборных назоўнікаў ........ 111
2.12. Скланенне і ўжыванне складанасастаўных назоўнікаў ........ 114
2.13. Ужыванне назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду з прыназоўнікам *па* ........ 116
2.14. Назоўнікі, якія абазначаюць асобу жаночага полу паводле сферы дзейнасці ........ 120
2.15. Асаблівасці ўжывання назоўнікаў клічнага склону ........ 128
2.16. Асаблівасці засваення нескланяльных назоўнікаў ........ 129

**РАЗДЗЕЛ 3. Сістэма словазмянення дзеясловаў сучаснай беларускай мовы** ........ 139

3.1. Асаблівасці словазмяняльнай сістэмы дзеясловаў ........ 139
3.2. Неазначальная форма дзеяслова ў сучаснай моўнай практыцы ........ 139
3.3. Ужыванне словаформ абвеснага ладу ........ 146
3.5. Ужыванне словаформ 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу ........ 166
3.6. Ужыванне словаформ загаднага ладу ........ 168
3.7. Ужыванне словаформ дзеясловаў з індывідуальнымі асаблівасцямі словазмянення ........ 172
3.8. Асаблівасці ўжывання дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява) і -ірава- (-ырава-) ........ 175

**Дзеепрыметнік** ........ 180

3.9. Асаблівасці ўтварэння дзеепрыметнікаў ........ 180
3.9.1. Ужыванне дзеепрыметнікаў незалежнага стану ........ 183
3.9.2. Ужыванне дзеепрыметнікаў незалежнага стану цяперашняга часу ........ 183
3.9.3. Ужыванне дзеепрыметнікаў незалежнага стану прошлага часу ........ 191
3.9.4. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў з часціцай -ся ........ 195

3.9.5. Ужыванне дзеепрыметнікаў залежнага стану ........ 196
3.9.6. Ужыванне дзеепрыметнікаў залежнага стану цяперашняга часу ........ 197
3.9.7. Ужыванне дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу ........ 200
3.10. Выкарыстанне дзеепрыметнікаў у якасці іншых часцін мовы ........ 209

**Дзеепрыслоўе** ........ 211
3.11. Асаблівасці ўтварэння дзеепрыслоўяў ........ 211
3.12. Выкарыстанне дзеепрыслоўяў у якасці іншых часцін мовы ........ 216

**РАЗДЗЕЛ 4. Прыметнік у сучаснай беларускай мове** ........ 218
4.1. Прыметнік у беларускім мовазнаўстве ........ 218
4.2. Спосабы ўтварэння новых прыметнікаў ........ 220
4.3. Новыя запазычанні з заходнееўрапейскіх і славянскіх моў ........ 244
4.4. Жаргонныя прыметнікі ........ 251
4.5. Прыметнікі-неасемантызмы ........ 253
4.6. Нязменныя прыметнікі ........ 255
4.7. Ступені параўнання прыметнікаў: спосабы выражэння ў сучаснай беларускай мове... 257
4.8. Асаблівасці скланення якасных і адносных прыметнікаў ........ 265
4.8.1. Ужыванне форм роднага склону жаночага роду адзіночнага ліку ........ 265
4.8.2. Ужыванне форм творнага склону жаночага роду адзіночнага ліку ........ 271

**РАЗДЗЕЛ 5. Прыслоўе ў сучаснай беларускай мове** ........ 275
5.1. Асноўныя асаблівасці прыслоўяў ........ 275
5.2. Пашырэнне лексічнага складу прыслоўяў: новаўтварэнні, запазычанні, актывізацыя ўжывання ўстарэлых лексем ........ 277
5.2.1. Пашырэнне стылістычных межаў размоўнай лексікі ........ 290
5.3. Формаўтварэнне прыслоўяў ........ 293
5.4. Формы ацэнкі прыслоўяў ........ 296
5.4.1. Прыслоўе як выразны мастацкі сродак ........ 297

**РАЗДЗЕЛ 6. Дынаміка сінтаксічных норм сучаснай беларускай мовы** ........ 300
6.1. Некаторыя аспекты даследавання дынамікі сінтаксісу беларускай мовы ........ 300
6.2. Аб актуалізацыі некаторых сродкаў выражэння састаўнога іменнага выказніка ........ 302
6.3. Сродкі выражэння параўнальнага і колькаснага значэння ў канструкцыях з кампаратывам ........ 311
6.3.1. Сродкі выражэння параўнальнага значэння ў канструкцыях з кампаратывам........ 311
6.3.2. Сродкі выражэння колькаснага значэння ў канструкцыях з кампаратывам ........ 318
6.4. Дынаміка ўжывання злучальнага слова *каторы* ў даданых азначальных сказах........ 323
6.5. Маўленчыя сінтаксічныя працэсы ў пісьмовых тэкстах ........ 331

**РАЗДЗЕЛ 7. Сучасныя інавацыйныя працэсы ў беларускай літаратурнай мове** ........ 344
7.1. Запазычанні з славянскіх і неславянскіх моў як сродак камунікацыі ........ 348
7. 2. Тэматычныя групы новай і актуальнай лексікі ........ 355
7.3. Адаптацыйныя магчымасці сучаснай беларускай мовы ........ 359

**Заключэнне** ........ 368

**Спіс скарачэнняў назваў слоўнікаў і граматык** ........ 376

**Спіс скарачэнняў назваў газет і часопісаў** ........ 378

**Тэматычны слоўнік запазычанай і актуальнай лексікі** ........ 380

**Літаратура** ........ 428

Навуковае выданне

**Еўсіевіч** Надзея Паўлаўна
**Ліхадзіеўская** Людміла Анатольеўна
**Русак** Валянціна Паўлаўна і інш.

**ДЫНАМІКА ЛІТАРАТУРНАЙ НОРМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

Рэдактар *Т. В. Лапцёнак*
Мастацкі рэдактар *Т. Д. Царова*
Тэхнічны рэдактар *В. А. Тоўстая*
Камп'ютарная вёрстка *В. М. Карповіч*

Падпісана да друку 05.08.2015. Фармат $70\times100^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 35,91. Ул.-выд. арк. 32,5. Тыраж 150 экз. Заказ 144.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, Мінск.